# КУПАЛЬСКІЯ ПЕСНІ: АД НАРОДНЫХ ТРАДЫЦЫЙ ДА СУЧАСНЫХ ТЭНДЭНЦЫЙ

# KUPALSKY SONGS: FROM NATIONAL TRADITIONS TO CURRENT TRENDS

*В. А. Зянькевіч, І. А. Камінская*
*V. Ziankevich, I. Kaminskaya*
*БДПУ (Мінск)*

*Анатацыя.* У артыкуле ідзе гаворка пра купальскія песні і стара-даўнія абрады, якія прысвечаны беларускаму святу Купалле. Беларускі самабытны фальклор з'яўляецца душой нашага народа, бясцэнным багаццем, створаным высілкам многіх пакаленняў. Беларуская песня працягвае жыць, гучаць, захапляць і знаходзіць увасабленне ў творчасці шматлікіх сучасных калектывах Беларусі.

*Annotation.* There is a speech in article about the kupalsky songs and the ancient ceremonies which are devoted to the Belarusian holiday of Kupalye. The belarusian original folklore is the soul of our people, the invaluable wealth created by effort of many generations. The Belarusian song continues to live, sound, admire and find the embodiment in the creativity numerous modern collectives of Belarus.

*Ключавыя словы:* купальскія песні, народнае свята «Купалле», фальклор, традыцыі, лірыка, творчасць, сучаснасць.

*Keywords:* the kupalsky songs, the national holiday of Kupalye, folklore, traditions, lyrics, creativity, present.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Беларуская народная музыка бярэ свой пачатак ад старажытнай культуры ўсходніх славян. Асаблівасцю народнай музыкі Беларусі з'яўляецца самабытны фальклор абраднасці песень (калядных, масленічных, купальскіх, жніўных, вясельных і г. д.).

Абрадава-песенны комплекс урачыстасці ў гонар летняга сонцастаяння Купала, пад рознымі найменнямі вядомы ўсім народам Еўропы, – адна з фундаментальных з’яў традыцыйнай культуры [1, с. 78]. Купальскія песні – купальныя песні, купалкі, янаўскія песні. Адносяцца да летняга цыкла каляндарна-земляробчага фальклору. Іх пачыналі спяваць за 2 тыдні да Купалля аднак сваё функцыянальнае прызначэнне яны выяўлялі ў купальскае свята: суправаджалі збор зёлак, выправу на

месца святкавання, спяваліся пры купальскім вогнішчы, у карагод пад час агледзінаў жыта, пускання вянкоў на рачную плынь. Звязаныя з найбольш старажытным культам славянскага язычніцтва, які нясе ў сабе адбітак касмаганічных міфалагічных уяўленняў. Замыкаюць непарыўны ланцуг веснавых абрадаў і папярэджваюць абрады жніва – Купалле адзначалася ў самы пярэдадзень даспявання жыта, калі земляроб клапаціўся аб захаванні ўраджаю ад розных стыхіяў, што ўяўляліся яму ў вобразах міфічных істотаў.

Асноўнае маеца ў купальскай паэзіі займае любоўная лірыка. У ёй адлюстравалася радасць чалавека – сведкі найвышэйшага росквіту прыроды, зямнога плёну, яго імкненне кахаць, быць шчаслівым. Адзін з цэнтральных вобразаў купальскіх песень – Купалінка (Купалка), якая выступае апякункай дзяўчатак, моладзі. Ёй дапамагае Купальнічак (Купаліш) – хлопец-завадатар гульняў пры купальскім вогнішчы.

У рэпертуар купальскіх песень уваходзяць творы для выканання як адной асобы, так і калектыву. Побач з калектыўным выказам лірычнага перажывання ў песнях Купалля часцей практыкуецца аб’ектывізаваны характар яго выражэння. Ад імя калектыву, купальскага гурту ў песні выказваецца пэўнае душэўнае памкненне, перажыванне. Найчасцей гучыць актуальная для дзяўчат, моладзі ў цэлым тэма будучага лёсу. Вобразнае ўвасабленне не рэалізуецца найчасцей на аснове абрадавага субстрату. У песні «Цёмная ночка купалчанка» абыгрываецца думка пра пасах, які традыцыйна ў беларускай дзяўчыны складваўся з набору ў жытковых рэчаў, натканых з лёну, актуальных ў сямейным жыцці. Паказальна, для вобразнага ўвасаблення задумы, стварэння мастацкай рэальнасці на эстэтычным узроўні абагульняюцца ўсе этапы вырабу на кроснах пасажных дароў [2, с. 234].

Беларускія народныя традыцыі, абрадавыя святы, песні і танцы і па сёняшні дзень працягваюць гучаць у творчасці розных праслаўленых калектывах Беларусі, такіх як Ансамбль народнай музыкі і танца «Купалінка», Ансамбль народнай музыкі «Бяседа», Беларускі дзяржаўны ансамбль народнай музыкі «Свята» і вядома ж Беларускі дзяржаўны заслужаны харэаграфічны ансамбль «Харошкі» – жывая легенда беларусаў. У рэпертуары ансамбля налічваецца больш за дзесяці тэатралізаваных праграм («Тураўская легенда», «Вяселле Цярэшкі», «Добры вечар, госці» і інш.). Унікальная ідэя мастацкага кіраўніка У. І. Гаявой – паказаць усе старадаўнія беларускія абрады ў адной праграме на найвышэйшым мастацкім узроўні ўвасобілася ў тэатралізаванай праграме «Беларусы» (Поры года), ярка і праўдзіва адлюстроўвае карціны народнага жыцця. Музыка, беларуская песня і танец дапаўняюць адзін аднаго; у выніку крапатлівай працы былі створаны незабыўныя музычна-харэаграфічныя карціны жыцця беларускага народа, старадаўніх абрадаў і святаў, такіх як, Мас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

леніца, Юр'еў дзень, Купалле, Каляды, Клiканне вясны, Беларускае вяселле і многія іншыя.

Культура вызначае твар нацыі. Яна гаворыць аб характары, самасвядомасці і надзеях народа больш за іншыя напрамкі дзейнасці чалавека. Лічыцца, что менавіта ад узроўню культуры, ад увагі да яе ў значнай ступені залежыць будучыня нацыі. Беларуская культура ўвабрала ў сябе самабытныя міфалагічныя, рэлігійныя, мастацкія і філасофскія ўяўленні беларусаў. Культура беларускага народа ўзыходзіць да глыбокай старажытнасці. Як і весь беларускі народ, яна прайшла вельмі складаны і супярэчлівы шлях. Таму і беларуская народная песня таксама з’яўляецца люстэркам нашага народа. Гэта вялікі пласт духоўнай культуры беларусаў, які працягвае жыць і радаваць сучаснае пакаленне.

## Літаратура


1. Беларускае Купалле ў кантэксце фальклорнай традыцыі славян. Тыпалагічны аспект: Аўтарэф. дыс. на атрыманне вучон. ступ. канд. філал. 10.01.09 / Наталевіч ьга Генадзьеўна. – Мінск, 2002. – 20 с.
2. Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкалегія: Г. П. Пашкоў (галоўны рэдактар) [і інш.]. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 2005—2006.
3. Купальскія і пятроўскія песні / Акадэмія навук Беларускай ССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. <http://portal.nlb.by/portal/page/portal/index/resources/expandedsearch?lang=ru&classId=B33E739B22884D82AACAC24EBFB1DA89&submitR=empty&_piref73_180746_73_34794_34794.biId=502015&_piref73_180746_73_34794_34794.strutsAction=biblinfoaction.do>– 234 с.
4. Ліс, А. С. Беларуская каляндарна-абрадавая песня ў кантэксце фальклорных традыцый славян / А.С. Ліс. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 296 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ